■ Фотаздымак з гісторыяй

# ПРЫЗЁРЫ, АДГУКНІЦЕСЯ!

**Цэлы год мы гарталі сямейныя альбомы і згадвалі цікавыя моманты з жыцця продкаў разам з удзельнікамі конкурсу «Фотаздымак з гісторыяй». Варта сказаць, што актыўнасць зашкальвала. Лісты, як электронныя, так і «ад рукі», з дарагімі сэрцу чорна-белымі фотакарткамі ішлі да нас з Докшыцкага, Свіслацкага, Бялыніцкага, Лельчыцкага, Гомельскага раёнаў, Мінска, Магілёва, Жодзіна, Краснаполля, Баранавічаў, Барысава, Чавусаў. Часам з іх нават утваралася «чарга» на месца ў наступным нумары «Сямейнай газеты». Некаторыя допісы з аповедам пра блізкіх людзей кранаді да слёз, некаторыя — адкрывалі новыя старонкі гісторыі, давалі бясцэнныя ўрокі жыцця. Надзвычай парадавала, што сярод удзельнікаў конкурсу — тры школьніцы. Цудоўна, што ёсць яшчэ моладзь, якая распытвае сваіх бабуль і занатоўвае іх каштоўныя ўспаміны. Бо, не сакрэт, з трывалымі каранямі па жыцці крочыць лягчэй.**



Перш чым назваць прызёраў, хацелася б падкрэсліць, што кожны, хто далучыўся да конкурсу, ужо з'яўляецца пераможцам. Вы зрабілі важную справу, што падзяліліся сваімі гісторыямі. Па-першае, таму што чалавек жывы, пакуль жыве памяць пра яго. Як піша адзінаццацікласніца Ганна Варонка: *«На фотакартцы мае продкі назаўсёды застануцца прыгожымі, вясёлымі, некранутымі часам. І якія падзеі ні адбываліся б у будучыні, у гэтае імгненне яны вечныя і заўсёды будуць жыць у маёй памяці...»*

Па-другое, некаторыя допісы яшчэ раз нагадалі чытачам пра вечныя жыццёвыя каштоўнасці, якія не мяняюцца з гадамі. У прыватнасці, «не рабі зло іншым, бо сам згарыш». І гэтую прапісную ісціну пацвярджае павучальная гісторыя, якую распавёў Уладзімір Шулякоўскі. Пра тое, як яго дзядзька, старшы сяржант Пётр Мікуліч, паранены ўцякаў па жыце ад нямецкага танка. *«Губляючы прытомнасць ад страты крыві, Пётр нейкім цудам умудрыўся ў апошні момант адсунуцца ад гатовай вось-вось расплюшчыць яго гусеніцы. Калі немец зразумеў, што занадта ён захапіўся паляваннем на бездапаможнага чалавека, наступіла расплата: з лесу па танку ўдарылі нашы гарматы...»*

Большасць гісторый, дасланых на конкурс, пра вайну, пра пакуты, якія перажылі людзі ў тыя гады. Яны яшчэ раз пацвярджаюць самаахвярнасць нашых дзядоў і прадзедаў, а таксама цярплівасць, аддагасць і сілу духу беларускіх жанчын, якія без мужа і часам без даху над галавой ставілі на ногі малых дзяцей...

*«Калі заходзіць гаворка пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны (хоць на вайне з першага да апошняга дня былі мой бацька і яго малодшы брат, хоць загінулі на фронце мой дзед і старэйшы бацькаў брат), я лічу, што самымі вартымі пашаны ветэранамі з'яўляюцца мае бабкі, мая маці і мільёны нашых жанчын, якія на сваіх хворых плячах вынеслі той неймаверны цяжар. І, на вялікі жаль, многім з іх за гэта яшчэ не адплачана...»* — піша афіцэр у адстаўцы Васіль Мікуліч з Барысава.

Амаль у кожным пасляваенным успаміне — пра тое, як было цяжка. Але, тым не менш, муж з жонкай трымаліся за сям'ю, мелі шмат дзяцей, паважалі адно аднаго.

*«На жаль, у сучасным нашым грамадстве аўтарытэт сям'і парушаны, аб чым сведчыць і колькасць разводаў, якая, паводле статыстыкі, стабільна высокая, і мноства шлюбаў без рэгістрацыі (так званае сужыццё, а на мой погляд — звычайная распуста), і колькасць адзінокіх старых, нашых жа бацькоў, якія ў найлепшым выпадку знаходзяць прытулак і спачын у дзяржаўных установах-інтэрнатах...* — разважае адзін з удзельнікаў конкурсу Валерый Гаўрыш з Чавусаў. — *Трэба наноў ствараць культ сям'і! Няхай жа фотаздымкі з гісторыяй прымусяць задумацца аб галоўных каштоўнасцях нашага кароткага зямнога веку — аб міры, сям'і і дзецях, узаемаразуменні — усіх чытачоў «Звязды».*

Абсалютная большасць надрукаваных у рубрыцы фотаздымкаў з гісторыямі настолькі цікавая, захапляльная і розная па змесце, эмацыйным пасыле, што вылучыць кагосьці аднаго было нерэальна... Менавіта таму ў нас па добрай традыцыі некалькі прызёраў.

Найбольш сімпатый набрала **Ганна ВАРОНКА з аграгарадка Нязбодзічы Свіслацкага раёна:** адзінаццацікласніца даслала вельмі цікавыя здымкі (найстарэйшы з іх 1898 года) і распавяла пакручастую гісторыю жыцця сваёй прапрабабулі, якая, згодна з сямейнай легендай, з'яўляецца пазашлюбнай дачкой цара Аляксандра II **(«Няпросты лёс дамы з сабачкам», 30 07.2015)**. Акрамя таго, прызёрамі сталі:

— **Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ з Мінска** — з гісторыяй пра цудоўнае выратаванне свайго дзядзькі Пятра Мікуліча **(«Паляванне ў жыце», 16.07.2015).** Ён да таго ж самы актыўны ўдзельнік конкурсу: Уладзімір даслаў у рэдакцыю ажно два цікавыя фотаздымкі з гісторыяй.

— **Наталля ФІЦНЭР з вёскі Буйнавічы Лельчыцкага раёна,** якая падзялілася з чытачамі «Сямейнай газеты» «маціным і бацькавым багажом», з якім яна крочыць па жыцці **(«Жыві і помні...», 11.06.2015)**.

— **Юлія ЯНУКОВІЧ з вёскі Параф'янава Докшыцкага раёна** з гісторыяй трох сёстраў, для якіх моцны падмурак бацькоўскага дома стаў асновай «імуннай сістэмы» супраць вірусаў зла ў самых розных яго абліччах **(«Акенцы ў мінулае», 13.11. 2014)**.

Асобны прыз — за дэталі і гумар (пра тое, як яе тата спаў «на прастоле ў Сталіна», пра 12 абразкоў святых, якія выратавалі яму жыццё падчас бамбёжкі, пра падушку, якую сціскаў брат, быццам граў на гармоніку) — заслужыла **Валянціна ШАРАПАВА, найстарэйшая жыхарка вёскі Старая Беліца Гомельскага раёна («Бацькава спадчына», 22.01.2015)**. Мы наўмысна не размяркоўвалі месцы — кожная гісторыя адметная па-свойму, і абсалютна ўсім аўтарам выказваем вялікую ўдзячнасць.

***Шаноўныя прызёры, віншуем вас ад усяго сэрца! Калі ласка, звяжыцеся з рэдакцыяй па тэлефоне 8 (017) 287 17 57 або па электроннай пошце info@zvyazda.minsk.by.***

***А конкурс, які так палюбіўся чытачам, працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавыя фотакарткі з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Як і раней, арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.***

■ Прэм'ера рубрыкі «ЭкаШколка»

# АДНОЙЧЫ ЛЕТАМ,
## або З чаго пачаць?

***У Гродне з'явілася дзіцячая экалагічная студыя. Гэта нефармальны адукацыйны курс для хлопчыкаў і дзяўчынак ад 4 да 10 гадоў, дзе эколагі і педагогі ў форме гульняў, актыўных лекцый і майстар-класаў расказваюць пра тое, як жыць з мінімальнай шкодай для навакольнага асяроддзя. «Сямейная газета» вырашыла даць магчымасць наведваць экаўрокі дзеткам і іх бацькам з іншых гарадоў і вёсак. Таму і распачынаем новую рубрыку, у якой сваім досведам і невялічкімі майстар-класамі будзе дзяліцца каардынатар студыі Рыма Ушкевіч.***



У НАШЫМ двары я неяк пачула, як адна дзяўчынка крычыць другой: «Пойдзем да дрэва дружбы!»

На ўсялякі выпадак перапытала:

— Да якога дрэва?

— Дружбы! — кажа тая.

— Хто яго так назваў? — не адчапляюся я.

— Мы, — кажа. Потым, быццам падумаўшы, ці можна раскрываць мне сакрэт, цішэй дадала:

— Мы яму падарункі носім...

— Хто вас гэтаму навучыў? — не веру я сваім вушам.

— Ніхто. Мы самі.

Пакуль я скемлівала, што да чаго, яна працягвала:

— Чалавек павінен любіць прыроду, і тады прырода будзе любіць людзей...

Гэта прагучала так кранальна, што я нават праслязілася.

НАШ двор — гэта кавалак вытаптанага зялёнага поля, падаткнутага з усіх бакоў дамамі і аўтамабілямі. З кожным годам машын становіцца больш, і яны пераходзяць у наступленне, адкусваючы па невялічкім кавалку газона вакол сябе. На ўвесь двор толькі адна сметніца, памерам з пяцілітровае вядро. Раніцай з акна я штодзень назіраю адну і тую ж карціну: дворнічыха ў апельсінавага колеру куртцы збірае пластыкавыя пакункі ад печыва, сухарыкаў, чыпсаў, абгорткі ад цукерак. І, здаецца, я чую яе праклёны.

Наш двор адзін з мноства двароў у спальных раёнах. Мы пражылі там тры гады, з моманту, калі нарадзіўся мой сын. За гэты час і я, вядома, перазнаёмілася з усімі мясцовымі мамамі: ведала, на што алергія ў Ілы, як спіць Ясенія, ці доўга звыкаўся з новым садком Міша... Амаль усе яны да дзіцячага садка наведвалі цэнтры ранняга развіцця. У іх вучылі маляваць, ляпіць, лічыць, чытаць і пашыралі кругагляд, наколькі гэта магчыма для чалавека аднаго-двух гадкоў. Па-першае, гэта такая мяккая сацыялізацыя жанчыны ў дэкрэце. Па-другое, хочацца для свайго дзіцяці найлепшага сцэнарыя: у маім дзяцінстве ролю развівальнага цэнтра выконвала цётка Лена, якая, абапершыся на бабуліну швачную машынку, гадзінамі слухала каталіцкае радыё «Марыя» і звяртала на мяне ўвагу толькі ў выключных выпадках.

Так што развіццё — гэта цудоўна. Але я за шырокае развіццё, глабальнае.

ЛЕТАМ мы з гарадзенскімі эколагамі ладзілі гульні для дзетак на вялікім Арт-Пікніку. Ідэя адной з іх была ў тым, каб вырубіць лес дзеля пабудовы супермаркета. Дзеткі ад 4 да 10 гадоў павінны былі на нейкі час уявіць сябе ляснымі жыхарамі, што пакутуюць ад лесарубаў, якія кавалак за кавалкам адбіраюць іх тэрыторыю. Але, насуперак нашым чаканням, «жывёлы» разам узбунтаваліся і не далі нам іх прагнаць, не далі нашым планам па пабудове супермаркета здзейсніцца. Тады я падумала, што да маёй ідэі, магчыма, саспеў інтарэс. Так праз некалькі месяцаў узнікла дзіцячая экалагічная студыя.

Зараз мы кожныя выхадныя ладзім сустрэчы для дзетак і бацькоў у Гродне — усе разам вывучаем нешта цікавае пра свет вакол нас. І, натуральна, дзейнасць людзей. Мы прыхільнікі пазітыўнага мыслення і прапаноўваем сваім маленькім вучням, як яны самастойна ці з дапамогай бацькоў могуць зрабіць сваю кватэру і свой двор больш экалагічна сяброўскімі, часам проста крышку змяніўшы некаторыя паўсядзённыя звычкі.

Але з чаго пачаць, каб гэта было проста і гарманічна ўлілося ў жыццё?

Па-першае, добра дапамагае звычайнае прыбіранне. Стала зашмат рэчаў? Не выкідайце! Пагледзіце, можа яны спатрэбяцца вашым знаёмым? Прыгатавана зашмат ежы і, верагодна, давядзецца выкідаць? Патэлефануйце сябру, запрасіце на вячэру ці на сняданак. Смецце не змяшчаецца ў адно вядро? Можна пачаць збіраць яго асобна, прынамсі пластык. А раптам і старая каробка ад абутку можа на першы час стаць кантэйнерам для макулатуры.

Захапіце шматразовую торбачку для паходаў у краму: гэта эканоміць безліч пластыкавых пакетаў, якія забруджваюць асяроддзе.

Каб адцягнуць дзіця ад камп'ютара, прапануйце яму сумесны майстар-клас па вырабе кантэйнера для выкарыстаных батарэек. Перад гэтым патлумачце, што выкінутая з агульным смеццем альбо проста на зямлю, яна забруджвае глебу і ваду і прымушае жывёл, якія жывуць паблізу, пакідаць свае дамы. Такі кантэйнер можна за паўгадзіны зрабіць са звычайнай кардоннай каробкі альбо з ПЭТ-бутэлькі, адмыслова размаляваўшы яе.

**Рыма УШКЕВІЧ.**



Оскар Уайльд: «НАЙЛЕПШЫ СПОСАБ ЗРАБІЦЬ ДЗЯЦЕЙ ДОБРЫМІ — ГЭТА ЗРАБІЦЬ ІХ ШЧАСЛІВЫМІ».

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.